


Фота Святланы ПРАКОФ'ЕВАЙ

# Крэўскія калядкі: жывая традыцыя таварыства «Этна»

*Коляда...*
*Бэгла колядко пэшком-пэшком.*
*Гэй, коляда!*
*Коляда...*
*Нэсла піражкі мэшком-мэшком.*
*Гэй, коляда!*

26 снежня ўжо мінулага 2008 года на вуліцах мястэчка Крэва «разносілі» калядныя песні і прымаўкі, а таксама калядны настрой сябры гісторыка-краязнаўчага таварыства «Этна» пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.

*Мы людзі не простыя,*
*Ідзем з далёкага краю,*
*З-пад самага раю.*

Ішлі і праўда здалёк, з намі каза і мядзведзь, дзяўчаты ў спадніцах доўгіх, хустках каляровых ды з галасамі звонкімі, а шлях нам калядная зорка асвятляла, часам разам з фотаапаратамі. Рыхтаваліся мы да святкавання загадзя, з лістапада штотыдзень збіраліся на сядзібе таварыства вучыць калядныя песні, каб гаспадарам паслухаць прыемна было і нам каб рэпертуар разнастайны мець.

Сутнасць «этнаўскага» калядавання не ў рэканструкцыі і дэманстрацыі старога абраду, а ў жывым святкаванні свята Божага Нараджэння і хуткага надыходу Новага года. Таму мы не пісалі дакладны сцэнарый і не пагарджалі флікерамі, фотаапаратамі і цёплымі кітайскімі курткамі, якія відавочна не з'яўляюцца элементамі традыцыйнай культуры. Мы не паказвалі абрад, а святкавалі, і разам з тым імкнуліся захаваць у святкаванні ягоныя істотныя рысы, якія дайшлі да нас ад дзядуляў і бабуляў: знешнія – у традыцыйным парадку свята, унутраныя – у настроі і спевах.

Традыцыйна ў кожнай хаце мы спявалі прывітальную песню, «гокалі» на козачку, каб яна гаспадарам на добры ўраджай паскакала ды гучна ўпала, і прасілі гаспадароў козаньку салам, піражкамі ды іншымі пачастункамі ажывіць. Пасля спявалі гучную звонкую «Будзь ваша здароў, як рыжак бароў» гаспадарам на добрае здароўечка і паспяховы год.

*Будзь ваша здароў,*
*Як рыжак бароў.*
*Май торбу грошай,*
*Жыві ў раскошы.*
*Май усяго даволі,*
*А бяды ніколі.*
*Гэй, каляда, калядзіца!*

Шчыра спадзяёмся, што нашыя словы і пажаданні спраўдзяцца крэўскім гаспадарам і нам на радасць. У той дзень мы павіншавалі і крэўскіх каталікоў, і праваслаўных, ксяндза і гаспадароў прадуктовай крамы. Мы дужа ўдзячныя за ўсмешкі, шчырасць і гасціннасць усім, хто нас прымаў.

Мы ішлі па марозных крэўскіх вуліцах, часам праз ручай, па снезе, спявалі пра красную Манечку, калядзіцу і добрае лета, пускалі нашу радасць у свет і, спадзяёмся, прыносілі яе ў хаты. Свята атрымалася не тэатралізаванае, а жывое і сапраўднае, бо прыносілі радасць, і цэлы вечар быў светлы.

Таварыства «Этна» з радасцю падзеліцца ўражаннямі і матэрыяламі (тэкстамі, запісамі песень) з цікаўнымі. Заходзьце, калі ласка, на наш сайт *etnachka.eu* і прыходзьце ў госці на гарбату і калядны пачастунак, пагутарым і паспяваем разам!

***Марына КАЛІНОЎСКАЯ***



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ